**УА «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»**
Кафедра беларускай і рускай моў

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў СІСТЭМЕ МЕДЫЦЫНСКАЙ АДУКАЦЫІ: ЗМЕСТ, СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ

ст. выкладчык
Носік А.А.

Мінск 2021

На сучасным этапе развіцця адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь кожная ВНУ, нават тэхнічнага профілю, мае цыкл гуманітарных дысцыплін. Галоўная задача вышэйшай адукацыі зводзіцца да гарманізацыі гуманістычнага прафесійнага складніка самасвядомасці і тэхналагічнага авалодання асновамі практычнай дзейнасці.

Несумненна, у наш час медыцынская адукацыя з’яўляецца адным з самых прагрэсіўных накірункаў, які ўяўляе сабой план падрыхтоўкі кампетэнтнага спецыяліста праз засваенне прафесійных ведаў і фарміраванне ўменняў і навыкаў аказання практычнай дапамогі. Чым раней будзе ўсвядомлена сутнасць і сапраўднае прызначэнне ўрача, тым больш эфектыўнай будзе рэалізацыя пастаўленых мэт і задач навучання ў цэлым.

Курс беларускай мовы для студэнтаў-медыкаў выкладаецца ў адпаведнасці з Праграмай, якая прадугледжвае засваенне і прафесійнае выкарыстанне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць розную інфармацыю на беларускай мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць любую думку, спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Мэтай курса з’яўляецца выпрацоўка і замацаванне практычных уменняў і навыкаў дасканалага карыстання вуснай і пісьмовай мовай.
Задачы: 1) развіццё моўна-эстэтычнага густу студэнтаў, звязанага з чысцінёй і правільнасцю мовы;

2) пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў, выпрацоўка ўменняў практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;

3) фарміраванне ўстаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

4) выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

Такім чынам, праца па арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсу зводзіцца галоўным чынам да авалодання навыкамі карыстання літаратурнай мовай у прафесійнай сферы і ў паўсядзённым жыцці праз далучэнне грамадска-патрыятычнага, духоўна-маральнага і эстэтычнага накірункаў.

Вызначальная роля ў ажыццяўленні ўсіх этапаў навучальнага і выхаваўчага працэсаў аддаецца выкладчыку. Яго першачарговай задачай з’яўляецца тлумачэнне неабходнасці авалодання беларускай мовай з акцэнтам на яе дзяржаўны статус, што дазволіць у далейшым ажыццяўляць прафесійную камунікацыю ў рамках прававога поля.

Свабоднае валоданне мовай дасягаецца за кошт правільнай арганізацыі дзейнасці па развіцці маўлення, якая заснавана на прымяненні наступных прынцыпаў:

1) адзінства развіцця маўлення і мыслення;
2) узаемасувязь у развіцці вуснага і пісьмовага маўлення;
3) сувязь працы па развіцці маўлення з вывучэннем граматыкі, арфаграфіі, пунктуацыі;
4) стылістычная накіраванасць;
5) прынцып тэкставага навучання.

Засваенне беларускай мовы ў прафесійным аспекцe накіравана на ажыццяўленне вербальных зносін у афіцыйнай сферы, якое прадугледжвае веданне як агульнаўжывальнай, так і вузкаспецыяльнай тэрміналагічнай лексікі праз выкарыстанне розных відаў творчых прац па развіцці маўлення: пераказу, перакладу, сачынення [2].

Нельга не адзначыць, што сфарміраваная моўная сітуацыя ў нашай краіне на сучасным этапе дэманструе цяжкасці падчас афармлення выказвання па-беларуску, бо крыніцамі як вучэбнай, так і агульнай інфармацыі з’яўляюцца ў большасці рускамоўныя друкаваныя выданні і электронныя рэсурсы. З улікам гэтага на занятках актыўна выкарыстоўваецца пераклад асобных тэрмінаў і лексем з рускай мовы на беларускую.

У сувязі з гэтым ключавой формай работы ў межах курса “Беларуская мова: прафесійная лексіка” з’яўляецца выпрацоўка навыкаў правільнага перакладу. Для яе правядзення выкарыстоўваюцца тэксты медыцынскай тэматыкі з улікам абранай спецыяльнасці, а таксама тэксты па гісторыі, культуры, этнаграфіі Беларусі, што адпавядае праграме курса.

Выкладанне беларускай мовы прадугледжвае дасягненне і выхаваўчых мэт, якія накіраваны на фарміраванне гарманічна развітай асобы і зарыентаваны на паспяховае ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці ва ўмовах білінгвізму. Маўленне ўрача – гэта складаны акт, які павінен ажыццяўляцца з улікам правіл маўленчых паводзін, прынятых у грамадстве, а таксама з падтрыманнем грамадскіх функцый беларускай мовы, прадугледжаных заканадаўствам.

Больш таго, маўленчая сітуацыя ў прафесійным асяроддзі ўрача вымагае ад яго ўлічваць ілакутыўныя мэты, псіхалагічны стан адрасата, інтарэсы камунікантаў (свае і субяседніка) і многія іншыя аспекты, прадыктаваныя канкрэтнымі абставінамі. Формы арганізацыі выхаваўчай работы адпавядаюць плану выхаваўчай работы кафедры, факультэта, вуза. Уся сістэма накіравана на фарміраванне кампетэнцый будучага спецыяліста і яго маральных якасцей. У выніку гэта дазваляе сфарміраваць асобу, здольную дапамагаць людзям у лячэнні як фізічных, так і душэўных пакут.

На сённяшні дзень для будучага ўрача Рэспублікі Беларусь надзвычай важна сфарміраваць правільнае разуменне сутнасці дзяржаўнага двухмоўя і выпрацаваць уменне жыць і працаваць у прававым полі, адным з важных аспектаў якога з’яўляецца прытрымліванне Закона Рэспублікі Беларусь “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 187-3 ад 13 ліпеня 1998 г.).

Сутнасць праблемы ў тым, што праз свае ўстановы дзяржава павінна забяспечыць кожнаму грамадзяніну права карыстацца той ці іншай мовай. Адсюль кожны супрацоўнік дзяржаўнай установы, з’яўляючыся прадстаўніком дзяржавы, павінен абавязкова валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі [1]. Каб усвядоміць вышэйсказанае, павінна быць праведзена вялікая і правільна арганізаваная работа.

Такім чынам, урач, з’яўляючыся прыкладам гуманізму, інтэлігентнасці, сумленнасці, прынцыповасці, бескарыслівасці, ветлівасці, павагі да навакольных самастойнасці, мэтанакіраванасці і многіх іншых станоўчых якасцей чалавека, адным з прыярытэтаў сваёй дзейнасці павінен таксама мець паважлівае і адказнае стаўленне да беларускай мовы [3]. Толькі ў такім выпадку Беларусь зможа захаваць сваю нацыянальную адметнасць і павагу з боку іншых дзяржаў свету.

Літаратура

1. Лукашанец, А. А. Беларуская мова ў XXI стагоддзі : развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання / А. А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 396 с.
2. Носік, А.А. Пераклад тэкстаў медыцынскай тэматыкі як сродак выхавання і навучання прафесійнай лексіцы / А.А. Носік, Н.В. Ратынская. – XX Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Тэхналогіі навучання рускай мове як замежнай і дыягностыка моўнага развіцця” – Мінск: БДМУ, 2019 (эл. зборнік). С. 301- 306.
3. Носік, А.А. Арганізацыя выхаваўчай работы са студэнтамі-медыкамі ў працэсе вывучэння беларускай мовы / А.А. Носік. – Материалы III международной научно-методической конференции. Под редакцией А.Р.Аветисова. 2019. С. 204-206.

# Дзякуй за ўвагу!